Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



# СКАРБНІЦА НАВУКОВЫХ ВЕДАЎ

## *(Да 90-годдзя Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі)*

*Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНБ НАН Беларусі) паўстала на хвалі адраджэння нацыянальнай культуры, у асяроддзі, якое сілкавала гэта адраджэнне, і была закліканая служыць маладой беларускай навуцы. У зборах бібліятэкі адлюстравана гісторыя нашай краіны, увасоблена гісторыка-культурная ідэнтычнасць беларускага народа, акумуляваны яго навуковы патэнцыял. Сёння яна з'яўляецца адной з найбуйнейшых бібліятэк нашай краіны. Яе фонд налічвае каля пяці мільёнаў адзінак захоўвання. Тут прадстаўленыя навуковыя працы па розных галінах навукі, а таксама найкаштоўнейшыя помнікі кніжнасці мінулага.*

Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі была заснаваная 16 лютага 1925 года як бібліятэка Інстытута беларускай культуры. Яна ўзнікла як *"падручная бібліятэка для паўсядзённай працы"* супрацоўнікаў Інбелкульта. Яе першым дырэктарам стаў дзеяч нацыянальнага руху, вучоны Іван Серада. Нагадаем, што 1 студзеня 1929 г. Інбелкульт быў рэарганізаваны ў Акадэмію навук БССР, а Бібліятэка Інбелкульта стала Бібліятэкай АН БССР. Сярод першых кніг, што заклалі падмурак бібліятэкі, былі кнігі з асабістых збораў расійскага філолага Якава Грота і народнага паэта Беларусі Янкі Купалы.

З самага пачатку існавання бібліятэкі яе зборы актыўна папаўняліся. З некалькіх соцень кніг і брашур у пачатку яе работы напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яны выраслі да 350 тыс. асобнікаў. У 1920—1930-я гг. гэтыя зборы папоўніліся кнігамі вядомых навукоўцаў: матэматыка Якава Громера (выхадца з Брэста, вучня і супрацоўніка Альберта Эйнштэйна), батаніка Уладзіміра Дактуроўскага, выдатнага беларускага гісторыка Мітрафана Доўнар-Запольскага, раслінавода і фізіёлага раслін Мікалая Малюшыцкага і інш. Аднак развіццё бібліятэкі на доўгія гады было перапыненае Вялікай Айчыннай вайной. Бібліятэка не была эвакуяваная. Наступствы ваенных падзей апынуліся для яе катастрафічнымі. Частка фонду бібліятэкі была знішчана. Найкаштоўнейшыя зборы былі разрабаваныя і толькі часткова вернутыя пасля заканчэння вайны. Бібліятэчны фонд па колькасці адзінак захоўвання дасягнуў даваеннага ўзроўню толькі ў канцы 1940-х гадоў. Актыўны рост фонду бібліятэкі стаў магчымым дзякуючы будаўніцтву для яе асобнага будынка (па адрасе: вул. Сурганава, 15), у якім яна размяшчаецца і сёння.

Сёння Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа мае самы вялікі ў Беларусі збор замежных навуковых выданняў прыродазнаўчай тэматыкі, з'яўляецца цэнтрам дэпазітарнага захоўвання ў галіне прыродазнаўчых навук, захавальніцай помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, метадычным цэнтрам па праблемах бібліятэчнай справы і бібліяграфіі, навукова-даследчым цэнтрам у галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства, кніжнай культуры і бібліяметрыі.

Аснову фондаў бібліятэкі складаюць навуковыя выданні. Бібліятэка дае доступ сваім карыстальнікам да так званага ядра найбольш цытуемых навуковых часопісаў. Зборы ЦНБ НАН Беларусі ўключаюць і значныя калекцыі, якія складаюць фонд гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Сярод іх калекцыя рукапісных кніг XVII—XX стст., збор кніг кірылічнага друку XVI — пачатку XX ст., калекцыя кніг грамадзянскага друку XVIII — першай чвэрці XIX ст., калекцыя выданняў XV—XXI стст. на замежных мовах, калекцыя беларускіх перыядычных выданняў, калекцыя замежных перыядычных выданняў XVIII—XX стст. і інш. Найкаштоўнейшы друкаваны матэрыял для даследчыкаў прадстаўляе Архіўны кніжны збор выданняў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Ён уключае ўсе друкаваныя выданні Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і архіўныя матэрыялы яе устаноў. Ядром рукапіснага фонду бібліятэкі з'яўляюцца асабістыя архівы вядомых беларускіх навукоўцаў і пісьменнікаў, якія зрабілі значны ўнёсак у развіццё айчыннай навукі і культуры: акадэмікаў В.Ф.Купрэвіча



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by





*Будынак Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі.* Сучаснае фота.

і А.С.Вечара, пісьменнікаў-акадэмікаў Пятра Глебкі і Кандрата Крапівы, народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, народнага паэта Беларусі Пімена Панчанкі, класіка беларускай літаратуры Максіма Гарэцкага і інш. У складзе рукапіснага фонду таксама знаходзяцца разнастайныя дакументы, аб'яднаныя ў "Калекцыю матэрыялаў па гісторыі, навуцы і культуры", што храналагічна адносяцца да XVI—XX стст.

Усё больш шырокае распаўсюджванне ў інфармацыйным абслугоўванні чытачоў бібліятэкі, навукоўцаў і спецыялістаў атрымліваюць электронныя носьбіты інфармацыі, якія даюць магчымасць задавальняць усе тыпы інфармацыйных запытаў. Таму ЦНБ НАН Беларусі значную ўвагу надае не толькі павелічэнню уласных фондаў, а і прадастаўленню сваім карыстальнікам доступу да аддаленых інфармацыйных рэсурсаў. Складнікамі электроннай падпіскі ЦНБ НАН Беларусі з'яўляюцца як паўнатэкставыя рэсурсы, так і рэфератыўныя базы дадзеных, базы дадзеных цытавання, а таксама інструменты для работы з падпіскай як адзіным інфармацыйным масівам. Бібліятэка дае доступ сваім карыстальнікам да важнейшых замежных навуковых баз дадзеных, яна мае самую вялікую ў Беларусі колькасць навуковых рэсурсаў аддаленага доступу. Адной з галоўных стратэгій дзейнасці ЦНБ НАН Беларусі з'яўляецца паступовы пераход да новых форм бібліятэчна-інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў. Пры гэтым акцэнт робіцца на пашырэнні спектру аддаленых анлайнавых каналаў абслугоўвання рэсурсамі бібліятэкі праз інтэрнэт.

У 1990 г. ЦНБ НАН Беларусі атрымала статус навукова-даследчай установы ў галіне бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства. Сёння бібліятэка ажыццяўляе навукова-даследчую дзейнасць таксама і ў галіне бібліяметрыі і кніжнай культуры. ЦНБ НАН Беларусі з'яўляецца арганізатарам міжнародных навуковых форумаў. Развіццё ўсіх напрамкаў дзейнасці ЦНБ НАН Беларусі ў розных галінах: навуковай, інфармацыйнай, культурнай — вызначаецца, ў тым ліку і партнёрскімі сувязямі бібліятэкі. Супрацоўніцтва з мноствам розных устаноў і арганізацый, сярод якіх найбуйнейшыя бібліятэкі, навуковыя ўстановы і культурныя цэнтры як Беларусі, так і замежных краін, дазволіла паўнавартасна камплектаваць фонды, каапераваць намаганні пры ажыццяўленні навукова-даследчых праектаў, арганізацыі навуковых мерапрыемстваў, падрыхтоўцы і выданні матэрыялаў па іх выніках.

За дасягненні ў розных галінах інфармацыйнай дзейнасці ЦНБ НАН Беларусі мае розныя ўзнагароды. Штогод, з 2005 па 2014 гг., узнагароджвалася дыпломамі Міжнароднай спецыялізаванай выставы і кангрэса па тэлекамунікацыях, інфармацыйных і банкаўскіх тэхналогіях "ТІВО" і Міжнароднай спецыялізаванай выставы "Перспектыўныя тэхналогіі і сістэмы: інфарматыка, тэлекамунікацыі, бяспека".

З'яўляючыся важным звяном у сістэме інфармацыйнага забеспячэння навукі, Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі актыўна пазіцыянуе сябе ў якасці прасторы для правядзення самых розных мерапрыемстваў — прэзентацый, выстаў, творчых і юбілейных вечароў, якія аб'ядноўваюць вакол сябе актыўных і творчых людзей навукі, культуры, адукацыі.

*Падрыхтаваў дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук* ***Аляксандр Груша.***



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by